PolotskSU



УДК 94(476)«1911/1916»

# ПРАБЛЕМА САМАГОНАВАРЭННЯ НА ПОЛАЧЧЫНЕ НАПЯРЭДАДНІ І Ў ПАЧАТКУ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1911 – 1916 гг.)

*С.В. МЯНЬЧЭНЯ*
Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, Мінск

У развіцці самагонаварэння на тэрыторыі Полацкага павета ў разглядаины перыяд выдзелена 2 этапы. Першы-да 1915 года, адзначаўся станаўленнем сеткі таемных бровараў, якія забяспечвалі Мясцовае сельскае насельніцтва і паступова сталі ствараць канкурэнцыю дзяржаўным крамам. На другім этапе-1915-1916 гг. ва ўмовах палітыкі "прымусовай цвярозасці", адсутнасць у пераважнай колькасці насельніцтва легальнай магчымасці купіць алкаголь стымулявала значны рост самагонаварэння і выхад яго прадукцыі на гарадскі рынак. Рост самагонаварэння пачынае разглядацца як рэальная пагроза дзяржаўнай бяспекі, аднак паліцыя, нягледзячы на ўсе намаганні, разабрацца з ім не змагла.

Сістэма дзяржаўнай “віннай” манаполіі, якая была ўведзена ў заходніх губернях у 1897 г., прадугледжвала стварэнне буйной сеткі казённых вінных крам, так званых “манаполек”. На 1903 г. па Віцебскай губерні іх налічвалася 388, з якіх 36 прыпадала на Полацк – 8 і Полацкі павет – 28 [1, арк. 193 – 200]. Насычэнне рынка якасным легальным алкаголем разам з жорсткім кантролем за нелегальнай вытворчасцю і продажам, на думку ініцыятараў рэформы, павінны былі прывесці да скаранення самагонаварэння і вытворчасці алкагольных сурагатаў. Данясенні павятовых спраўнікаў і дакументы Акцызнага Ўпраўлення дазваляюць зрабіць высновы аб выніковасці дадзеных мерапрыемстваў.

У дакументах фіксаваліся віды праванарушэнняў, імёны праванарушальнікаў і памер пакарання. У 1900 г. па Полацкаму павету фіксуецца 27 выпадкаў парушэнняў асноўная колькасць якіх звязана з безпатэнтным продажам – перапродажам казённага віна, а таксама распіццём у забароненых месцах [2, арк.83, 123, 192, 319, 354, 436, 481, 536, 602]. Але далейшыя падзеі, звязаныя з павышэннем коштаў на гарэлку і змяншэннем акцызаў на палітурны лак і дэнатуратны спірт у 1907 г. прывялі да карэнных змен. Па паведамленню наглядчыка 2-га вокруга Віцебскага Акцызнага Ўпраўлення Ўпраўляючаму Акцызнымі зборамі Віцебскай губерні ад 15 снежня 1907 г. за № 5430 пасля таго як ў 1907 г. быў зніжаны акцыз на палітуру з 6 ½ капеяк да 2, у Полацк было ўвезена 3304 пудоў 28 фунтаў палітуры (вага разам з тарай) супраць 95 пудоў у 1905 г. Вялікі попыт быў абумоўлены ростам спажывання палітуры, пры чым не толькі праз перагонку, але і проста ў чыстым выглядзе (для асаджэння смалістых рэчываў дадавалі соль). Ад дадзенага напою не толькі п’янелі, але і звярэлі – некалькі асоб звар’яцелі і былі накіраваны ў адпаведныя ўстановы [3, арк. 20-21]. Калі перагонка

PolotskSU

палітуры была звычайна з'явай гарадской, то ў сельскай мясцовасці распаўсюджваецца самагонаварэнне.

Буйная сетка таемных бровараў існавала ў Тураўлянскай воласці. 27 верасня 1911 г. на імя Віцебскага губернатара прыходзіць ананімны ліст аб самагонаварэнні ў Полацкім павеце сярод сялян вёсак Асінаўка, Кісялі, Антунова, Альшаніца, Будзішча і інш. Завадатарамі лічыліся жыхары вёскі Асінаўка браты Мікалай і Міхаіл Папковы , якія мелі ўжо вялікі досвед у гэтай справе, бо гналі гарэлку ўжо 10 год у сваім лесе, мелі апарат і нават вучылі гнаць самагон і іншых. Папковы былі ўзброены, рабілі заявы аб сваіх сувязях з паліцыяй і пагражалі мясцовым жыхарам адпомсціць у выпадку даноса. Павятовая паліцыя некалькі раз рабіла аблавы, але беспаспяхова, хадзілі чуткі, што Тураўлянскі ўраднік атрымлівае ўзнагароджанне ад самагоншчыкаў і папярэджвае іх аб вобыску. Сяляне навакольных вёсак у манапольку амаль не звярталіся, калі трэба была гарэлка – гналі самі, ці ішлі да самагоншчыкаў. У лісце былі названы і іншыя імёны – Марцін Іванковіч (в. Кісялі), браты Авер'янавы (в. Антунова), селянін па мянушцы Ясненькі (в. Будзішча), селянін Мікалай (в. Альшаніца) [3, арк. 1 – 2].

У ноч на 8 кастрычніка ў Тураўлянскую воласць з мэтай пошуку самагоншчыкаў і падцвярджэння фактаў, выкладзеных у ананімцы былі накіраваны Полацкі павятовы спраўнік, акцызны кантралёр, прыставы 1-го і 2-га стану, 6 ураднікаў і 20 конных стражнікаў. Вынікі экспедыцыі былі наступныя. У вёсцы Будзішча ў селяніна Івана Бабкова (ён жа Ясненькі) былі знойдзены бутэлькі і бочкі з-пад самагона (усё было схавана па розных месцах, штосьці ў спецыяльных схронах пад зямлёй). У лесе непадалёк ад вёскі знойдзены бровар і некалькі месцаў яго ранейшага знаходжання, непадалёк ад апарата – карыта з-пад брагі, а побач сляды свіней і кароў. У якасці доказу віны Бабкова было пазначана, што  свінні і каровы яго мелі чорныя зубы, што ўзнікае ў выніку кармлення жывёлы брагай. Была знойдзена краюха хлеба,  якая мела тую ж структуру, што і бохан хлеба ў хаце Бабкова. Канчаткова падцвердзілі віну Бабкова яго дочкі, якя апазналі знойдзены побач з броварам кубачак [3, арк. 7 – 8]. У іншых мясцовасцях паліцыя такога поспеху не дасягнула. У вёсцы Альшаніца ў Міхаіла Хацкевіча знойдзены бутэлькі з рэшткамі самагона. У Асінаўцы ў братоў Папко знойдзены некалькі бачонкаў, адзін і іх поўны – па словах Папко, купілі ў невядомага яўрэя ў мястэчку Гомель, другі пусты). Вёска Кісялі – у Іванковіча не знайшлі нічога. Па выніках праверкі Хацкевіч і Папко былі аштрафаваны за нелегальны гандаль спіртнымі напоямі [3, арк. 8].

Невядома, ці падцвердзілася сувязь мясцовых паліцэйскіх з самагоншчыкамі, але ўраднік Тураўлянскай воласці на наступны дзень звольнены [3, арк. 10].

Праз месяц пасля апісаных вышэй падзей, у ноч на 8 лістапада прыставам 2-га стану Палесскім-Шыпіла каля вёскі Зыкава быў выкрыты схаваны ў лесе бровар, абсаджаны вакол для маскіроўкі зрубленымі елкамі. Тут жа былі знойдзены чан з брагай, другі выліты. На месцы нікога не знайшлі, але сляды прывялі да двара Пятра Валенціонка, як высветлілася, завод арганізаваў яго брат з суседзямі. Па вёсцы знойдзены былі бутэлькі і бачонкі з самагонам. Бровар працаваў ужо доўгі час, за 2 гады

PolotskSU



да гэтага Валенціонак, ужо трапляў у поле зроку ахоўных органаў, калі рабіла вобыск лепельская павятовая паліцыя, але нічога не знайшла [3, арк. 13 – 14].

4 снежня 1911 г. на імя губернатара зноў прыходзіць ананімны ліст, аўтар якога дзякуе за тое, што справе далі ход, але ўсё ж браты Папко заставаліся на свабодзе і зброю ў іх не канфіскавалі, бо не знайшлі. Ананім папярэджваў, што перад Калядамі ў вёсках будуць зноў гнаць гарэлку, называў канкрэтныя імёны, а напрыканцы паведаміў пра існаванне ў Тураўлянскай воласці рэвалюцыйнага гуртка, звязанага з Полацкам і Лепелем, і аб значнай колькасці зброі, пры чым і ў асоб, якія займаюцца самагонаварэннем [3, арк. 27 – 32]. Па выніках новай праверкі паліцыя здолела знайсці толькі завод ў вёсцы Шашы, у іншых мясцовасцях толькі бутэлькі. Зброю знайшлі ў некаторых асоб, але інфармацыя наконт братоў Папковых не падцвердзілася [3, арк. 38 – 39].

У снежні былі арганізаваны праверкі ў іншых валасцях. 19 снежня ў вёсцы Бельчыца Банонскай воласці знойдзены бровар па перагонцы паліітуры. 20 снежня выкрыты завод у фальварку Антонава (арандатар Станіслаў Пілецкі), а непадалёк ранейшае месца, яшчэ не засыпанае снегам. 22 – 23 снежня па заяве мясцовага селяніна была праведзена праверка ў вёсцы Плігаўка Замашанскай воласці – знойдзены самагон, але ні бровара, ні яго слядоў не знайшлі [3, арк. 36, 40].

Новая акцыя была ажыццеўлена ў сакавіку 1912 г. 12 сакавіка ўпраўляючы Акцызнымі зборамі ў звароце да губернатара наведамляў, што ў Лепельскім, Полацкім і Дрыссенскім паветах распаўсюджана выганка гарэлкі з хлеба і паліітуры, таму трэба было прыняць меры, бо хутка Вялікдзень – будуць гнаць шмат. У выніку рэйда паліцыя выкрыла бровары ў фальварку Мухавец Тураўлянскай воласці, вёсках Асетна і Калошына Струнскай воласці [3, арк. 52, 56 – 58]. За красавік 1912 г. у Полацкім павеце было зафіксавана 7 выпадкаў перагонкі паліітуры, знойдзены 1 бровар (уласніка на знайшлі), 1 выпадак беспатэнтнага продажу [3, арк. 68]. Увогуле за 1912 г. колькасць парушэнняў склала 48 (амаль у 2 разы больш у параўнанні з 1900 г.) [4]. Далейшы рост правапарушэнняў можна вызначыць на аснове табліцы складзенай па матэрыялах павятовага спраўніка за 1911 – 1914 гг. (таб. 1).

Табліца 1. – Парушэнні піцейнага статута ў Полацкім павеце ў 1911 – 1914 гг.[4–6]

| | студзень | люты | сакавік | красавік | май | чэрвень | ліпень | жнівень | верасень | кастрычнік | лістапад | снежань | за год |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1911 | няма дадзеных | н/д | н/д | н/д | 4 | 3 | 4 | 2 | 0 | 0 | 0 | 4 | 8 |
| 1912 | 3 | 9 | 6 | н/д | 7 | 2 | 5 | 1 | 1 | 2 | 3 | 9 | 48 |
| 1913 | 2 | 3 | 5 | 11 | 1 | 3 | 6 | 3 | 8 | 8 | 1 | 6 | 57 |
| 1914 | 2 | 8 | 6 | 16 | 10 | 8 | 4 | 2 | 4 | 0 | 0 | 2 | 62 |

PolotskSU



Акрамя відавочнага роста колькасці правапарушэнняў назіраюцца і змены ў іх структуры – рост колькасці выпадкаў самагонаварэння і вытворчасці сурагатаў з палітурнага лака і дэнатуратнага спірта. Так, за перыяд са студзеня па верасень 1913 г. было зафіксавана 12 выпадкаў выганкі спірта, 19 – беспатэнтнага продажу, астатнія 10 – без пазначэння зместа правапарушэння [4, арк. 204, 244, 267, 279, 298, 342, 345, 366, 389].

Рост спажывання алкаголя прымусіў улады шукаць новыя метады барацьбы, і са студзеня 1914 г. быў абраны курс на ліквідацыю манаполек разам з узмацненнем кантроля. Пачатак Першай сусветнай вайны паскорыў дадзены працэс. 16 ліпеня 1914 г. была выдадзена пастанова аб спыненні ўсялякага гандлю моцнымі напоямі ва ўсіх раёнах, дзе будзе абвешчана мабілізацыя, а таксама на шляхах следвання войск. Выключэнне складалі рэстараны 1-га разрада, клубы і сходы. 23 жніўня 1914 г. забарона на продаж моцных напояў была працягнута да канца ваеннага часу [7, арк. 2, 99]. Новая сістэма атрымала ў тагачаснай літаратуры назву “прымусовая цвярозасць” [8]. Мясцовыя сходы атрымалі шырокія правы на ліквідацыю кропак продажу алкагольных напояў на сваёй тэрыторыі. 4 лістапада 1914 г. Упраўленне Акцызнымі сборамі Міністэрства Фінансаў распаўсюдзіла цыркуляр, які пачынаўся наступнымі словамі: “для устранения соблазна к пьянству, который до сего времени создавался чрезмерностью числа мест продажи питей, как в городах, так и в сельской местности, число мест продаж необходимо очень и очень уменшить” [9, арк. 112]. У сельскай мясцовасці ў невялікіх паселішчах з 1 студзеня 1915 г. продаж моцных напояў цалкам забараняўся. У мястэчках продаж мог быць дазволены, але з асаблівай асцярожнасцю. Дазвол на гандаль прыватным асобам выдаваўся толькі на год, усе папярэднія дазволы скасоўваліся з 1 студзеня 1915 г. [9, арк. 111]. Корчмы на выездах з гарадоў і ўздоўж буйных шляхоў забараняліся. Пастаялыя двары і заезжыя дамы характарызаваліся як “наиболее вредные притоны”, таму частка з іх, як месцы “непригодные и неопрятные” маглі быць таксама зачынены. Усялякае сумненне наконт далейшага існаваннння асобных піцейных устаноў павінна было вырашацца ў бок яго ліквідацыі [9, арк. 112адв. - 113].

Першыя некалькі месяцаў вайны адзначыліся падзеннем колькасці правапарушэнняў, але знікненне легальнага алкаголя, што асабліва адчувалася ў сельскай мясцовасці, пацягнула за сабой значны рост вытворчасці сурагатаў, што бачна па дакументах 1915 г. У ліпені 1915 г. за самагонаварэнне былі прыцягнуты да адказнасці браты Мікіта і Анісім Хахель (вёска Немарознь, Петрапаўлаўская валасць). У кастрычніку таго ж года ў павеце было выкрыта ўжо 6 выпадкаў самагонаварэння, прычым браты Хахелі трапіліся паліцыі зноў. У лістападзе – 2 выпадку выганкі самагона і адзін перагонкі дэнатуратнага спірта [10, арк. 6, 43адв. – 44].

За студзень – сакавік 1915 г. Полацкая гарадская паліцыя разгледзіла 19 спраў аб парушэннях правіл продажу алкаголя. З іх у 2 выпадках ішла гаворка аб самагоне, у 7 – аб хлебным спірце, 5 – аб дэнатураце. У горадзе і ваколіцах было знойдзена 7 таемных бровараў, але пры гэтым улады атрымлівалі ананімкі з абвінавачваннямі паліцыі ў недаглядзе. Праўда, у адрозненні ад лістоў, аб якіх ішла гаворка вышэй, тут асобы, віноўныя ў вытворчасці самагона, не называліся. На думку паліцэйскіх, такія лісты маглі з’яўляцца помстай саміх самагоншчыкаў і сродкам дыскрэдытацыі першых [11, арк. 24 -27].

PolotskSU



Негледзячы на намаганні паліцыі сітуацыя з самагонаварэннем толькі пагаршалася. У Полацку ў жніўні 1916 г. было зафіксавана 10 выпадкаў продажу самагона, у верасні – 12, лістападзе – 9, снежні – 11. Сітуацыя ў павеце была значна горшая – толькі ў жніўні 1916 г. было выкрыта 27 выпадкаў самагонаварэня. Бровары знаходзіліся далёка ад вёсак у лесе, таму прыцягнуць да адказнасці канкрэтных асоб было вельмі складана [12, арк. 157-158, 289-292, 547-548, 743-744]. Але гэта, па сутнасці, была толькі вяршыня айсберга.

23 жніўня 1916 г. Віцебскі губернатар атрымаў данясенне з грыфам “Сакрэтна” ад начальніка контр-разведавацельнага аддзялення пры штабе Дзвінскага Ваеннай Акругі: “По имеющимся сведениям, в районе Полоцкого уезда местные жители, преимущественно крестьяне, тайно изготовляют водку чуть-ли не повсеместно в лесу, на болотах, недоступных без проводника и почти в каждой деревне. На базарах и ярмарках самогонная водка продаётся с возов открыто наравне с прочими крестьянскими напитками” [12, арк. 303 – 303адв.]. Далей ішло патрабаванне аб неабходнасці прыняцця жорсткіх мер – па-першае, прадукцыя такіх бровараў часта трапляла на фронт, а па-другое, там ня рэдка знаходзілі прытулак дэзерціры. Такім чынам, самагонаварэнне пераўтваралася ў праблему дзяржаўнай бяспекі, бо пагражала баяздольнасці арміі ва ўмовах пазіцыйнай вайны.

Паліцыя вымушана была зноў трымаць удар, павятовы спраўнік даў справаздачу аб выкрыцці з спачатку года 178 выпадкаў самагонаварэння і продажу самагона, і ліквідацыі 129 бровараў (таб. 2). Агульная з лічба за 1916 г. складае 289 спраў, што ў 5 разоў перавышае паказчык 1913 г. Сярод “лідэраў вытворчасці” адзначалася Струнская воласць, дзе ў студзені – жніўні 1916 г. было заведзена 23 справы [12, арк. 319–320].

Табліца 2. – Колькасць выпадкаў самагонаварэння і продажу самагона па Полацкаму павету за 1916 г. [12, арк. 299,321 – 334, 429, 608, 837]

| | студзень | люты | сакавік | красавік | май | чэрвень | ліпень | жнівень | верасень | кастрычнік | лістапад | снежань | за год |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1916 | 3 | 9 | 17 | 20 | 38 | 40 | 24 | 27 | 25 | 23 | 22 | 41 | 289 |

Такім чынам, развіццё самагонаварэння на тэрыторыі Полацкага павета ў разглядаемы перыяд адбывалася ў 2 этапа. Першы – да 1915 г., адзначаўся станаўленнем сеткі таемных бровараў, якія забяспечвалі мясцовае сельскае насельніцтва і паступова сталі ствараць канкурэнцыю дзяржаўным крамам. Гэтаму садзейнічалі асаблівасці асаблівасці прыроднай прасторы – наяўнасць цяжкадаступных лясных і балотных мясцовасцей. На другім этапе – 1915 – 1916 гг., ва ўмовах палітыкі “прымусовай цвярозасці”, адсутнасць у пераважнай колькасці насельніцтва легальнай магчымасці купіць алкаголь стымулявала значны рост самагонаварэння і выхад яго прадукцыі на гарадскі рынак. У сувязі з падзеямі Першай сусветнай вайны самагонаварэнне пачынае разглядацца не

PolotskSU



проста як правапарушэнне, але як і рэальная пагроза дзяржаўнай бяспекі, з якой паліцыя, негледзячы на ўсе намаганні, разабрацца не здолела.

ЛІТАРАТУРА

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (Мінск) (НГАБ). – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 45837.
2. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 44364.
3. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 47995.
4. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 48236.
5. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 48033.
6. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 48533.
7. НГАБ (Гродна). – Ф. 1. Воп. 27. Спр. 2948.
8. Введенский, И.Н. Опыт принудительной трезвости / И.Н. Введенский. – М. : Московское Столичное Попечительство о Народной Трезвости, 1915. – 51 с.
9. НГАБ (Гродна). – Ф. 30. Воп. 1. Спр. 447.
10. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 49336.
11. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 50048.
12. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 50064.

## THE PROBLEM OF MOONSHINING IN THE POLOTSK DISTRICT ON THE EVE OF AND AT THE BEGINNING OF THE FIRST WORLD WAR (1911 – 1916)

*S. MYANCHENYA*

*The author identifies two stages in the development of moonshining on the territory of the Polotsk Uyezd during the period of 1911 – 1916. The first - until 1915, was marked by the establishment of a network of secret distilleries, which provided the local rural population and gradually began to create competition for state stores. At the second stage – 1915–1916 years. in conditions of the policy of "forced sobriety," the lack of a legal opportunity to buy alcohol from an overwhelming number of the population stimulated a significant increase of moonshining and the release of its products to the urban market.The growth of brewing begins to be considered a real threat to state security, but the police, despite all efforts, could not deal with him not was able.*